ДУК “ГРОДЗЕНСКАЯ АБЛАСНАЯ НАВУКОВАЯ БІБЛІЯТЭКА
ІМЯ Я.Ф.КАРСКАГА”

АДДЗЕЛ КРАЯЗНАЎСТВА

# Краязнаўчы каляндар на 2018 год

Гродна, 2017

Краязнаўчы каляндар на 2018 год створаны на аснове фактаграфічнай картатэкі "Слынныя імёны Гарадзеншчыны", якая змяшчае звесткі з энцыклапедычных выданняў: Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Мінск: БелЭн., 1996 – 2004; Республика Беларусь: энцикл.: в 6 т. – Минск: БелЭн., 2005 – 2008; Беларусь: энцыкл. давед. – Мінск: БелЭн., 1995; Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мінск: БелЭн., 1993 – 2003; Культура Беларусі: энцыкл.: у 6 т. – Мінск: БелЭн., 2010 – 2015; Мысліцелі і асветнікі Беларусі. X – XIX стст.: энцыкл. давед. – Мінск: БелЭн., 1995; Асветнікі зямлі беларускай. X – пач. XX стст: энцыкл. давед. – Мінск: БелЭн., 2001; ВКЛ: энцыкл.: у 3 т. – Мінск: БелЭн., 2005 – 2010; Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: у 5 т. – Мінск: БелСЭ, 1984 – 1987; Беларускія пісьменнікі: біябібліягр. слоўн.: у 6 т. – Мінск: БелЭн., 1992 – 1995; Тэатральная Беларусь: энцыкл.: у 2 т. – Мінск: БелЭн., 2002 – 2003; Беларускі фальклор: энцыкл.: у 2 т.– Мінск: БелЭн., 2005 – 2006; Народная культура Беларусі: энцыкл. давед. – Мінск: БелЭн., 2002; Спортивная энциклопедия Беларуси. – Минск: БелЭн., 2005; Туристская энциклопедия Беларуси. – Минск, 2007; Пяткевіч, А. Людзі культуры з Гродзеншчыны: давед. / Аляксей Пяткевіч. – Гродна, 2000; Долготович, Б. Военачальники земли белорусской: энцикл. справ. / Борис Долготович. – Минск: БелЭн., 2005; Выкладчыкі Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я.Купалы: біябібліягр. давед. – Гродна, 1999; Заведующие кафедрами и профессора Гродненского государственного медицинского (института) университета (1958-2003). – Гродно, 2003; Книга героев Гродненской области. – Гродно, 2005; Культура Гродзеншчыны: Факты. Падзеі. Асобы. — Мінск, 2014; Твои герои, Беларусь! Герои Социалистического Труда : биогр. справ. — Минск, 2014; Твои сыновья, Беларусь! Герои Советского Союза : биогр. справ. — Минск, 2015; Ермоленко, В.А. 400 имен: жизнеописания видных деятелей истории и культуры Гродненщины / В.А. Ермоленко, В.Н. Черепица. — Гродно, 2014; Гостев, А.П. Известные личности Гродно / А.П. Гостев. — Херсон, 2015; Гостев, А.П. Известные уроженцы Гродненской области / А.П. Гостев. — Гродно, 2016; Почётные граждане города Гродно: биобиблиогр. справ. — Гродно, 2017.

Адбор юбілейных дат рабіўся ў адпаведнасці са значнасцю іх для гісторыі, эканомікі і культуры краю. Для персаналій юбілейнымі вырашана лічыць: 50, 60, 70, 75, 80, 90, 110, 120, 125, 130, 140, 150… і далей гадоў. Для іншых юбілейных падзей: 20, 25, 30, 40, 50… і далей як для персаналій гадоў. Указваюцца сувязі дзеячоў з Гродзеншчынай. Даты даюцца па новаму стылю, геаграфічныя аб'екты – згодна сучаснага адміністрацыйна-тэрытарыяльнага дзялення.

Краязнаўчы каляндар на 2018 год змяшчае звесткі аб звыш 290 юбілеях прадстаўнікоў розных галін дзейнасці, прадпрыемстваў, арганізацый, устаноў, але складальнікі не прэтэндуюць на абсалютна поўную інфармацыю. Бібліятэкары могуць дапоўніць гэту працу новымі звесткамі пра свае рэгіёны.

Спадзяёмся, што наш каляндар будзе карысным і цікавым для чытачоў, навукоўцаў, краязнаўцаў і бібліятэкараў.

**У 2018 годзе спаўняецца:**

**890** гадоў з часу першага ўпамінання **г.Гродна** ў Іпацьеўскім, Лаўрэнцьеўскім і Радзівілаўскім летапісах (1128).



**760** гадоў з часу першага ўпамінання ў Іпацьеўскім летапісе г.п.**Зэльва**, цэнтра раёна (пад 1258).



**550** гадоў з часу першага ўпамінання ў пісьмовых крыніцах г.**Астравец**, цэнтра раёна (1468).



**520** гадоў з часу першага ўпамінання ў даравальным акце гетману літоўскаму князю К.І. Астрожскаму г.**Дзятлава**, цэнтра раёна (1498).

**475** гадоў з часу заснавання **"Літоўскай капэлы"**, аднаго з найбольш ранніх аркестравых калектываў на Беларусі (Гродна; 1543 – пасля 1601).

**450** гадоў з часу стварэння **гравюры М. Цюнта па малюнку Г. Адэльгаўзера**, **адной з самых старых выяў г.Гродна**, якая ілюструе прыём Жыгімонтам ІІ Аўгустам паслоў Івана IV Грознага ў Гродне (1568).

**400** гадоў з часу заканчэння будаўніцтва **Гродзенскага кляштара бернардзінцаў** (1618).

**340** гадоў з пачатку выдання першага інфармацыйнага бюлетэня на Беларусі **"Awizy grodzienskie" ("Гродзенскія весці")** (1678).

**340** гадоў з пачатку будаўніцтва **касцёла Святога Францішка Ксаверыя ў Гродне** (1678).

**340** гадоў з дня нараджэння **Керсніцкага Анастаза Людвіка** (1678, в.Гальшаны Ашмянскага раёна – 1733), каталіцкага публіцыста, педагога. Выкладаў у езуіцкім калегіуме ў Гродне.

**320** гадоў з дня нараджэння **Храптовіча Марцыяна** (1698, в.Шчорсы Навагрудскага раёна – 1766), дзяржаўнага дзеяча ВКЛ, старосты вярбельскага.

**300** гадоў з дня нараджэння **Галоўкі Казіміра** (1718 – пасля 1773), асветніка, педагога, выдаўца. Першапачатковую адукацыю атрымаў у Навагрудку і Гродне.



**300** гадоў з дня нараджэння **Пільштын (Пільштынова**, дзявочае **Русецкая) Саламеі Рэгіны Іахімаўны** (1718, Навагрудчына – 1760), асветніцы, мемуарысткі, падарожніцы, лекаркі.

**290** гадоў з дня нараджэння **Несялоўскага Юзафа** (1728 – 1814, в.Варонча Карэліцкага раёна), дзяржаўнага і палітычнага дзеяча ВКЛ. У 1765 г. – падкаморы навагрудскі. У 1765-1773 – кашталян навагрудскі. З 1773 г. – ваявода навагрудскі.

**250** гадоў з дня нараджэння **Бжазінскага Адама** (1768? **-** ?), беларускага танцоўшчыка. Да 1785 г. – прыгонны А. Тызенгаўза, вучыўся ў яго балетных школах ў Гродне і Паставах. З 1785 г. – саліст трупы "Таварыства танцоўшчыкаў Яго Каралеўскай Вялікасці" С. А. Панятоўскага.

**240** гадоў з дня нараджэння **Бутаўта-Андржайковіча Міхаіла Фадзеевіча** (1778 – 1830), расійскага дзяржаўнага дзеяча. У 1817-1824 гг. – гродзенскі губернатар.

**240** гадоў з дня нараджэння **Быхаўца Юзафа** (1778, в.Хмяльніца Слонімскага раёна – 1845), польскага асветніка, пісьменніка, філосафа, перакладчыка.

**240** гадоў з дня нараджэння **Друцкага-Любецкага Францішка Ксаверыя** (1778 – 1846), расійскага ваеннага і дзяржаўнага дзеяча. У 1812 г. – маршалак Гродзенскай губерні. У 1816 г. – гродзенскі губернатар.

**230** гадоў з часу стварэння **Свіслацкага тэатра Тышкевіча**, прыватнай трупы графа В.Тышкевіча (1788).

**225** гадоў з часу ўтварэння **Гродзенскага ваяводства**, адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі ў ВКЛ (1793 – 1795).

**225** гадоў з дня нараджэння **Петрашкевіча Ануфры** (1793, Шчучын – 1863), польскага і беларускага паэта, архівіста, аднаго з заснавальнікаў таварыства філаматаў.

**225** гадоў з дня нараджэння **Шыдлоўскага Ігната Іосіфавіча** (1793 – 1846), беларускага і польскага паэта, перакладчыка, выдаўца, фалькларыста, педагога. Працаваў выкладчыкам у Свіслацкай гімназіі.

**220** гадоў з дня нараджэння **Яцкоўскага Ігната** (каля 1798, Навагрудчына – 1873), беларускага і польскага пісьменніка, мемуарыста, удзельніка паўстання 1830-1831 гг. Працаваў адвакатам у Навагрудку.

**210** гадоў з дня нараджэння **Бахматовіча Казіміра** (1808, в.Дабраўляны Смаргонскага раёна – 1837), беларускага і літоўскага мастака-графіка, аўтара бытавых замалёвак, якія маюць этнаграфічную каштоўнасць. Быў хатнім настаўнікам малюнка ў дабраўлянскім маёнтку графа А.Гюнтэра.

**210** гадоў з дня нараджэння **Мухлінскага Антона Восіпавіча** (1808, в.Валеўка Навагрудскага раёна – 1877), рускага і беларускага вучонага-арыенталіста, усходазнаўца, педагога, члена-карэспандэнта Расійскай акадэміі навук, прафесара.

**200** гадоў з дня нараджэння **Зяньковіча Якава Аўксенцьевіча** (1818 – 1888?), беларускага мастака. У 1860-1880 гг. працаваў настаўнікам малявання ў Гродзенскай мужчынскай гімназіі.

**200** гадоў з дня нараджэння **Сангіна Станіслава** (каля 1818 – 1863), аднаго з кіраўнікоў паўстання 1863-1864 гг. на Беларусі і ў Літве, удзельніка Гродзенскай рэвалюцыйна-дэмакратычнай арганізацыі.

**180** гадоў з дня нараджэння **Бацюшкава Дзмітрыя Мікалаевіча** (1838 – 1909), расійскага дзяржаўнага дзеяча. У 1890-1899 гг. – гродзенскі губернатар.

**180** гадоў з дня нараджэння **Кулжынскага Рыгора Іванавіча** (1838 – 1910), беларускага этнографа, фалькларыста, педагога. У 1861-1868 гг. настаўнічаў у Гродзенскай гімназіі, быў інспектарам народных вучылішчаў Гродзенскай губерні.



**175** гадоў з дня нараджэння **Баранецкага Восіпа (Іосіфа) Васільевіча** (1843, Гродзеншчына – 1905), расійскага батаніка, прыродазнаўца, педагога, члена-карэспандэнта Пецярбургскай АН, прафесара.

**175** гадоў з дня нараджэння **Качана Васіля Андрэевіча** (1843 – 1910), беларускага каваля, разьбяра па камені, майстра па вырабу надмагільных помнікаў. Жыў у Гродне.

**175** гадоў з дня нараджэння **Мілюціна Дзмітрыя Міхайлавіча** (1843 – ?), гісторыка, краязнаўца, педагога. У 1904-1915 гг. – настаўнік Марыінскай жаночай гімназіі і рэальнага вучылішча ў Гродне, член Гродзенскага археалагічнага і статыстычнага камітэтаў, Гродзенскага педагагічнага таварыства.



**170** гадоў з дня нараджэння **Скабалановіча Мікалая Афанасьевіча** (1848, Гродзенская губерня – 1918), гісторыка-візанцініста, царкоўнага гісторыка, доктара багаслоўя, прафесара.

**160** гадоў з дня нараджэння **Лявінскага Элханана Лейба** (1858, в.Падбярозы Смаргонскага раёна – 1910), яўрэйскага пісьменніка, журналіста, сіянісцкага дзеяча.

**160** гадоў з дня нараджэння **Ромбры Якава** (1858, в.Жупраны Ашмянскага раёна – 1922), яўрэйскага асветніка, пісьменніка, журналіста.

**160** гадоў з дня нараджэння **Урублеўскага Ігнація** (1858, Гродзеншчына – 1953), мастака, архітэктара.

**150** гадоў з часу ўзвядзення **будынка чыгуначнага вакзала ў Гродне** (1868).

**150** гадоў з дня нараджэння **Пякарскага Фларыяна** (1868, Слонім – 1919), польскага мастака.

**140** гадоў з дня нараджэння **Манасеіна Уладзіміра Сяргеевіча** (1878 – ?), гісторыка, краязнаўца, члена Гродзенскага царкоўна-археалагічнага камітэта.

**130** гадоў з дня нараджэння **Тарасевіч Агаты Анупрэеўны** (1888, в.Пілкі Мастоўскага раёна – 1948), беларускай самадзейнай паэткі.

**130** гадоў з дня нараджэння **Шылы Мікалая Язэпавіча** (1888, в.Бакшты Іўеўскага раёна – 1948), беларускага палітычнага і грамадскага дзеяча, журналіста, педагога.

**125** гадоў з дня нараджэння **Жыткевіча Сямёна Мікалаевіча** (1893, в.Вялікая Кракотка Слонімскага раёна – 1940), беларускага грамадска-культурнага дзеяча. У 1914 г. скончыў Свіслацкую настаўніцкую семінарыю. Настаўнічаў на Дзятлаўшчыне. У 1927 г. арганізаваў беларускую бібліятэку ў в. Вялікая Кракотка Слонімскага раёна.

**125** гадоў з дня нараджэння **Снапко Юркі** (сапр. **Лявіцкі Язэп Язэпавіч**; 1893(?), Гродзенская губерня – 1916), беларускага паэта. У 1913 г. скончыў Гродзенскую мужчынскую гімназію, уваходзіў у Гродзенскі гурток беларускай моладзі.

**125** гадоў з дня нараджэння **Шыманоўскага Станіслава Вінцэнтавіча** (1893, в. Данюшава Смаргонскага раёна – 1920), беларускага паэта, удзельніка Першай сусветнай вайны.

**120** гадоў з часу **першай дэманстрацыі кінематографа ў Гродне** (1898).

**120** гадоў з дня нараджэння **Магілёва Мікалая Веніямінавіча** (1898 – 1967), беларускага вучонага ў галіне акушэрства і гінекалогіі, доктара медыцынскіх навук, прафесара. У 1961-1967 гг. працаваў у Гродзенскім дзяржаўным медыцынскім інстытуце.



**120** гадоў з дня нараджэння **Шыфраса Аляксандра Львовіча** (1898, Гродна – 1938), савецкага ваеннага дзеяча, удзельніка грамадзянскай вайны, армейскага камісара другога ранга, начальніка ваенна-гаспадарчай акадэміі Чырвонай арміі, члена Ваеннага савета пры наркоме абароны СССР.

**100** гадоў з часу адкрыцця **беларускай прагімназіі ў Гродне** (1918).

**100** гадоў з дня нараджэння **Гакеля Міхаіла Адэльбертавіча** (1918 – 1944), удзельніка вызвалення Гродзеншчыны ў Вялікую Айчынную вайну, Героя Савецкага Саюза (1945).

**100** гадоў з дня нараджэння **Зязева Пятра Пракопавіча** (1918 – 1995), удзельніка вызвалення Гродна ў Вялікую Айчынную вайну, супрацоўніка органаў дзяржаўнай бяспекі, падпалкоўніка. У 1944-1958 гг. – намеснік, потым начальнік Гродзенскага раённага аддзела НКДБ.

**100** гадоў з дня нараджэння **Лінёва Леаніда Аляксандравіча** (1918 – 1980), літаратуразнаўца, педагога. У 1949-1956 гг. працаваў у Гродзенскім дзяржаўным педагагічным інстытуце.



**100** гадоў з дня нараджэння **Фурсенкі Івана Сямёнавіча** (1918 – 1944), удзельніка вызвалення Гродзеншчыны ў Вялікую Айчынную вайну, Героя Савецкага Саюза (1945).



**70** гадоў з часу заснавання **Гродзенскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў**, УА (1948).

**70** гадоў з пачатку дзейнасці **Слонімскага народнага тэатра** (1948 – 1990).

**60** гадоў з часу стварэння завода **“Аўтапровад”** (Шчучын; 1958).

**60** гадоў з часу заснавання **Гродзенскай абласной арганізацыі ГА “Беларускі саюз журналістаў”** (1958).

**60** гадоў з часу стварэння **Гродзенскага кансервавага завода**, ААТ (1958).

**60** гадоў з пачатку дзейнасці **Навагрудскага дзяржаўнага аграрнага каледжа,** УА (1958).

**50** гадоў з часу стварэння **гідралагічнага заказніка рэспубліканскага значэння “Дзікае”** (Свіслацкі раён Гродзенскай вобласці, Пружанскі раён Брэсцкай вобласці; 1968).

**50** гадоў з часу заснавання **“Гродна Рамбыттэхнікі”**, ААТ, прадпрыемства па рамонту бытавых машын і прыбораў (1968).

**50** гадоў з часу адкрыцця **Помніка воінам-вызваліцелям** на Савецкай плошчы ў г.Гродна (1968).

**40** гадоў з часу стварэння **біялагічнага заказніка рэспубліканскага значэння “Гожаўскі”** (Гродзенскі раён; 1978).

**40** гадоў з часу стварэння **біялагічнага заказніка рэспубліканскага значэння “Парэцкі”** (Гродзенскі раён; 1978).

**40** гадоў з часу стварэння **біялагічнага заказніка рэспубліканскага значэння “Сапоцкінскі”** (Гродзенскі раён; 1978).

**40** гадоў з часу стварэння **біялагічнага заказніка рэспубліканскага значэння “Слонімскі”** (Слонімскі раён; 1978).

**30** гадоў з часу абвяшчэння **старой часткі Гродна помнікам горадабудаўніцтва і культуры** (1988).

**25** гадоў з часу заснавання прыватнага ўнітарнага **трыкатажнага прадпрыемства “Ромгіль”,** лаўрэата Прэміі Урада Рэспублікі Беларусь за дасягненні ў галіне якасці 2011 года (Слонім; 1993).

**25** гадоў з часу стварэння спартыўнага **баскетбольнага клуба “Гродна-93” (**1993).

**20** гадоў з часу заснавання **біялагічнага заказніка рэспубліканскага значэння** “**Замкавы лес”** (Ваўкавыскі раён; 1998).

**20** гадоў з часу заснавання **ландшафтнага заказніка рэспубліканскага значэння “Сарачанскія азёры”** (Астравецкі раён; 1998).